Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# Сцяг соцыялізма

Орган Чашніцкага РК КП(б)Б і раённага совета дэпутатаў працоўных

20 (126) | Панядзелак 26 сакавіка 1945 года | Цана 15 кап.

## Масава-палітычная работа на сяле

Блізіцца пасяўная кампанія. Поспех правядзення ў сціслыя тэрміны сяўбы ва многім будзе залежыць ад арганізатарскай работы партыйных, совецкіх і зямельных органаў, ад пастаноўкі палітычнай работы на сяле.

Пастаноўка работы агіт-калектываў у значнай меры падсадзейнічаў добрай падрыхтоўцы к вясне ў Лазукоўскім, Дварэцкім і др. сельсоветах. І наадварот, слабасць палітычнай работы ў Іванскім, Пачаўскім і Альшанскім сельсоветах ва многім азначылася на адставанне падрыхтоўкі к пасяўной кампаніі. Недастаткова таксама пастаўлена палітычная работа сярод работнікаў МТС нашага раёна.

Для таго, каб у сціслыя тэрміны і высокаякасна правесці сяўбу, палітычна забяспечыць поспех гэтай важнейшай ваенна-гаспадарчай кампаніі трэба к палітычнай рабоце сярод калгаснікаў, калектываў МТС прыцягнуць партыйны, совецкі і комсамольскі актыў, настаўнікаў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі, перадавікоў калгасаў і МТС. Падрабязна расказаць калгаснікам аб ваенна-палітычным становішчы Совецкага Саюза, аб дзяржаўным плане развіцця сельскай гаспадаркі на 1945 год, азнаёміць іх агратэхнічна-гаспадарчымі мерапрыемствамі. Неабходна шырока арганізаваць соцыялістычнае спаборніцтва і рэгулярна праводзіць узаіма-праверку выканання абавязацельств, дазадзіць вынікі да кожнага працоўнага праз нізавы друк, раённую газету, па радыё. У гэты перыяд асабліва добра павінны працаваць хаты-чытальні, рэгулярна выпускацца насценгазеты. Важную роль павінна зараз сыграць сельская моладзь. Яна павінна стаць ініцыятарам, запявалам у арганізацыі і правядзенні пасяўной.

## Семінар сакратароў КСМ арганізацыйі

Справаздачна выбарчыя сходы паказалі, што многія сакратары пярвічных комсамольскіх арганізацый працуюць упершыню. У іх вялікае жаданне да работы, але ў іх недастаткова вопыт практычнай работы.

Улічваючы гэта РК ЛКСМБ з 16 па 20 сакавіка арганізаваў пры райцэнтры семінар сакратароў пярвічных комсамольскіх арганізацый нашага раёна. На семінары прысутнічала 32 чалавекі. Ім было прачытана рад лекцый на тэмы: „Даклад тав. Сталіна аб 27 гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі", „Совецкая моладзь у дні Айчыннай вайны", „Правядзенне агіт. прапагандработы сярод моладзі", „Чырвоная Армія—Армія вызваліцельніца", „Партыя большэвікоў у дні Айчыннай вайны", „Статут ВЛКСМ", „Канстытуцыя СССР", „Вынікі прайшоўшага с-гаспадарчага года і задачы КСМ арганізацый у цякучым годзе", „Статут с-гаспадарчай арцелі" і др.

У час работы семінара сакратары КСМ арганізацый атрымалі адказы на ўсе хвалюючыя іх пытанні, якія сустракаюцца ў практычнай рабоце, абмяняліся вопытам работы, выказалі свае прапановы.

Яны атрымалі неабходныя веды, якія садзейнічаюць рашэнню задач па палітычнаму выхаванню моладзі.

Асаблівая ўвага была звернута на вывучэнне рашэнняў XIII пленума ЦК ВЛКСМ.

Хамічэнка

## Самадзейнасць у калгасах

К дню Парыжскай камуны калектыў настаўнікаў Грынькоўскай і Трухнавіцкай школ, Лазукоўскага сельсовета арганізавалі выезд па калгасам сельсовета. 18 сакавіка адбылося паседжанне ў калгасе „Ц. Трухнавічы", дзе прысутнічалі калгаснікі суседніх калгасаў.

З дакладам аб дню Парыжскай комуны выступіў дырэктар Грынькоўскай НСШ тав. Багдановіч. Калгаснікі прагледзілі пасля даклада самадзейнасць настаўніцкага калектыва.

Байкоў

## АД СОВЕЦКАГА ІНФОРМБЮРО

### З аператыўнай зводкі за 24 сакавіка

На працягу 24 сакавіка на Данцыгскім напрамку войскі 2-га Беларускага фронта працягвалі наступальныя баі і авалодалі гор. Праў—вузлом чыгуначных і шасейных дарог, і занялі рад насялённых пунктаў. У баях за 23 сакавіка на гэтым участку фронта узята ў палон да 1000 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Войскі 1-га Украінскага фронта працягвалі наступленне і авалодалі ў Сілезіі заходней ракі Одэра, гарадамі Нальсе і Лекушы сільнымі апорнымі пунктамі немцаў і другімі насялёнымі пунктамі.

Войскі 3-га Украінскага фронта у раёне паўднёва-заходней гор. Будапешта адбілі атакі адзінаццаці танкавых дывізій немцаў і зматаўшы сілу праціўніка, перайшлі ў наступленне, прарвалі сільна ўмацаваную абарону немцаў і прасунуліся ўперад на 70 км., працягласцю па фронту на 120 км., авалодалі гор. Секешфехервар, Мор, Зірц, Веспрэм, і др. гарадамі, а таксама захапілі больш 350 др. нас. пунктаў. Войскі фронта захапілі ў палон больш 6000 нямецкіх салдат і афіцэраў, захапілі і знішчылі 745 танкаў і больш 800 гармат і др. трафеі. Праціўнік страціў толькі забітымі больш 70.000 немцаў. У ліку 11 разгромленых танкавых дывізій, разбіта 4 танкавых дывізіі з 6-ай танкавай арміі „С. С.", перакінутых сюды з Заходнега фронта.

На працягу 23 сакавіка на ўсіх участках фронта падбіта і знішчана 204 нямецкіх танкаў і самаходных гармат. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 107 самалётаў праціўніка.

## НЕАДКЛАДНА ПРЫНЯЦЬ МЕРЫ

Совецкія школы павінны быць укамплектаваны добрымі настаўніцкімі кадрамі, якія змаглі-б па-сапраўднаму выхоўваць маладое пакаленне, апраўдвалі даручаную ім вялікую справу.

Зусім па іншаму абстаіць справа ў Стаяшчанскай школе (вёска Аксянцы), Пачаўскага сельсовета. У гэтай школе працуе настаўніцай Баброва А, якая па спецыяльнасці вагонаважатая і мае адукацыю толькі 4 групы і ёй даручылі выхоўваць дзяцей. Яна не займаецца павышэннем свайго адукацыйнага і ідэйна-палітычнага ўзроўню, к заняткам не рыхтуецца. Справа дайшла да таго, што дзеці адказваюцца ісці ў школу, ды і бацькі іх не пушчаюць,,.—Усё роўно яны там нічога не навучацца",—кажуць яны.

Замест заняткаў з адстаючымі, якія прыходзяць к ёй на дом, яна прымушае іх насіць ёй ваду і калоць дровы, а затым адпраўляе дзяцей дамоў, як-бы навучыўшы дзяцей асвеце.

Калектыў настаўнікаў Пачаўшчыны не раз зварачваўся аб гэтым у РайАНА, але чамусці Баброва працягвае рабіць безадказную працу ў школе.

Так далей гэтак быць не можа. РайАНА павінна прыняць неадкладныя меры аб падборы добрых настаўніцкіх кадраў у Стаяшчанскай школе.

Жара

## ПАВЫСІЦЬ ТЭМПЫ АДНАЎЛЕННЯ ФАБРЫКІ

Нямецка-фашысцкія варвары поўнасцю разбурылі Чашніцкую паперовую фабрыку „Чырвоная Зорка". Пасля выгнання фашыстаў, мы знайшлі толькі развaліны.

З першых дзён калектыў фабрыкі актыўна ўзяўся за адраджэнне яе, дзе першай работай была ачыстка ад развалін і хлама. Была адноўлена вузкакалейная чыгунка фабрыка—торф. завод, працягласцю ў 8 км., капітальна адрамантавана і пушчана ў ход 2 матавоза з 25 выганеткамі. Праведзен капітальны рамонт шлюзаў, турбіны, мастоў і каналаў. Адноўлены механічныя майстэрні з пускам 2-х такарных станкоў, 2-х свярдлільных станкоў і строгальнага станка, якія зараз працуюць на мэты пуску ў ход папяровых машын. Адноўлена механічная кузніца, пабудавана 3 кавальскіх горна, адрамантаван паветраправод, заменены вінцілятары. Зноў адноўлен лесапільны цэх, дзе эманціравана піларама і шпаларэзальны станок.

Зараз заканчваецца перакрыццё рольнага цэха, рамонт 3-га паравога катла, праводзіцца капітальны рамонт 3-цяй бумажнай машыны, якую намячаецца пусціць у ход у маі месяцы. Вядуцца падрыхтоўчыя работы па рамонту 500-сільнага лакамабіля.

Перадавымі рабочымі па фабрыцы, якія штодзённа перавыконваюць нормы выпрацоўкі на 130-200 проц. з'яўляюцца: Корбан Х. Т.—брыгадзір электрааддзела, Сулкоўскі Б. І.—токар, Скабіцкі І. С.—брыгадзір брыгады плотнікаў, Лайко Палагея К.—машыніст лакамабіля Падалеца Елізавета М.—брыгадзір брыгады жанчын, Пазьняк А. В.—брыгадзір брыгады вузкакалейшчыкаў, Скарупа І. Ф.—пячнік, Іваноў В. В.—кровельшчык і др.

Аднак на раду з гэтым тэмпы аднаўлення фабрыкі маглі быць лепшымі, калі-б актыўней у гэтым удзельнічалі-б калгасы раёна, была-б большая падтрымка з боку раённых устаноў у справе дапамогі цяглавай сілай, што ва многім затрымлівае рамонт фабрыкі. Трэба адзначыць, што недахопам з'яўляецца і тое, што на рабоце не разгорнута соц. спаборніцтва не адмячаюцца на дошцы гонару перадавыя рабочыя і прыклады іх працы не прывіваюць другім. Недастаткова пастаўлена палітыка-выхаваўчая работа, не праводзяцца даклады і гутаркі, рэдка чытаюцца газеты. Даўно ўжо вы пушчалася насценгазета, агіткалектыў фабрыкі працуе з рук вон дрэнна.

Пуск у ход фабрыкі—вялікая дзяржаўная-гаспадарчая задача і неабходна прылажыць усе сілы на аднаўленне яе.

## ПІСЬМО З ФРОНТА

### Калгаснікам калгаса 2-я пяцігодка Пачаўскага сельсовета

Дарагія калгаснікі і калгасніцы!

У дні, калі наша Чырвоная Армія падыходзіць усё бліжэй к логаву фашысцкага звера, шлю Вам сваё гарачае франтавое прывітанне з тэрыторыі Германіі.

Мы, байцы і камандзіры, Чырвонай Арміі, натхнёныя гістарычным загадам нашага палкаводца Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна, яшчэ мацней пачалі граміць праклятую немчуру, з большым жаданнем і энергіяй рвёмся ўперад, у логава звера, каб там канчаткова задушыць яго і тады ён больш не зможа парушыць наша мірнае, шчаслівае жыццё.

На прыкладу нашых воінаў Вы калгаснае сялянства, павінны яшчэ больш павялічыць усямерную дапамогу фронту ў хутчэйшым разгроме ворага. Лепшай вашай дапамогай і падарункам нам, фронту, з'явіцца дастойная падрыхтоўка к вясенне-пасяўной кампаніі і правядзенне своечасовай і добраякаснай сяўбы, што паслужыць залогам атрымання высокага ўраджая ў 1945 годзе і гэта будзе адным з вялікіх удараў па фашыстам.

Чырвоная Армія завяршае разгром ворага. Недалёк час, калі мы ўзнімем сцяг перамогі над Берлінам. Загад правадыра будзе выканан!

Адказваючы на поспех Чырвонай Арміі вы павінны яшчэ больш усіліць работу па аднаўленню разбуранай народнай гаспадаркі нямецкімі разбойнікамі.

Грызываю Вас, таварышы калгаснікі і калгасніцы, лепш падрыхтавацца к вясне і ў самыя сціслыя тэрміны правесці пасяўную, і жадаю Вам хутчэй падняць калгасную гаспадарку на высокі ўзровень.

С прывітаннем к Вам,
Ваш зямляк л-нт
Пазняк Т. Е.

Адказны рэдактар
А. Р. ПУХАВІЦКІ